**2003 год**

**Качук, Ю. Зэльвенскі Ганненскі кірмаш / Юлія Качук // Зяльвяначка. – 2003. - №8. – ліпень. – С. 4-5.**

Найбольшы росквіт тутэйшага Ганненскага кірмашу прыходзіцца на канец XVIII – першую палову XIX стагоддзя. Зэльвенскі кірмаш не меў сабе роўных на Беларусі.

У 1840 годзе, па звестках з архіўных крыніц, на кірмаш было прывезена розных тавараў коштам ў 584,4 тысячы рублёў, а з канца 50-х гадоў гэта сума вырасла да двух мільёнаў рублёў.

Сапегі пабудавалі на квадратнай плошчы некалькі соцень каменных лавак, але іх заўсёды было недастаткова для купцоў. Лаўкі размяшчаліся часткова ў галоўным корпусе і ўнутраным двары, часткова – у вялікіх драўляных будынках, якія прылягалі да галоўнага ўвахода, падчас кірмашу адчыняліся шынкі, вінніцы, піўныя, кавярні.

У спецыяльна пабудаваным памяшканні дзейнічаў тэатр. Пастаноўкі тут былі рознажанравымі. Часта ў тэатры выступалі артысты з Вільні, Расіі і з-за мяжы, ладзіліся імпрэзы, дэманстраваліся цыркавыя праграмы. А з вечара і да самай раніцы грымеў аркестр скрыпак у складзе 15 музыкаў, каб задаволіць ахвочых да танцаў.

Пры апісанні тэатра Юзэф Ігнацій Крашэўскі заўважае, што “насуперак звычаям тых гадоў у тэатры адсутнічалі ложы, дзе маглі б сядзець прадстаўнікі арыстакратыі. Ложы замяніў “дэмакратычны” балкон, які запаўняла розная публіка”.

Пасля разбораў Рэчы Паспалітай, у выніку якіх Зэльва ў ліку іншых беларускіх гарадоў адышла да Расійскай імперыі, адбыўся заняпад не толькі кірмашовай справы, але і ўсёй эканомікі Беларусі. Пасля антырасійскага паўстання 1830 года Зэльвенскі Ганненскі кірмаш у другой палове XIX стагоддзя прыйшоў у заняпад. З перапынкамі ў ліхалецці Зэльвенскі мясцовы кірмаш праіснаваў ажно да пачатку Першай сусветнай вайны. У пачатку XXI стагоддзя была спроба адрадзіць славуты Ганненскі кірмаш у Зэльве, але па сутнасці сваёй цяперашні кірмаш пакуль яшчэ не дасягнуў былой значнасці.